# Памерла Ядвіга Грыгаровіч



31 ліпеня, не дажыўшы менш за месяц да свайго 65-годдзя, пайшла ў лепшы свет шчырая беларуска **Ядвіга Грыгаровіч**.

Ядвіга Дамінікаўна Грыгаровіч нарадзілася 24 жніўня 1946 года ў шляхочай сям'і на Бабруйшчыне, скончыла сярэднюю школу, музычную школу, літаратурна-музычны факультэт МДПУ імя А. М. Горкага. У Менскім інстытуце культуры працавала дацэнтам кафедры псіхалогіі і педагогікі, загадчыкам кафедры тэорыі і методыкі культурна-асветніцкай работы, прарэктарам па вучэбнай рабоце. З лістапада 1992 г. па снежань 2007 г. – рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. На пасаду рэктара была абрана калектывам універсітэта. Пры ёй у Статут універсітэта быў унесены запіс: *"Асноўная мова выкладання - беларуская"*. Перавяла ўсё справаводства ўніверсітэта, акрамя бухгалтэрыі, на беларускую мову. Большасць прадметаў ва ўніверсітэце выкладалася па-беларуску. Спрыяла дзейнасці ТБМ ва ўніверсітэце. Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь, доктар педагагічных наaук, прафесар, член-карэспандэнт Беларускай акадэміі адукацыі. У 2000 г. абрана членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, была намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па сацыяльных пытаннях. З 2007 г. з'яўлялася Старшынёй Экспертнага савета ВАК Рэспублікі Беларусь. Член Савета па абароне дысертацый пры Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. Член Савета па абароне дысертацый пры БДПУ. Член Савета Фонду славянскіх культур (г. Масква). У лютым 2008 г. рашэннем Савета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Ядвізе Дамінікаўне Грыгаровіч было прысуджана званне "Ганаровы Рэктар БДУ культуры і мастацтваў". У жніўні 2010 года рашэннем Савета Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка доктару педагагічных навук, прафесару кафедры псіхалогіі і педагогікі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, заслужанаму работніку адукацыі Рэспублікі Беларусь Я. Д. Грыгаровіч было прысвоена званне «Ганаровы прафесар БДПУ».

Аўтар 4 манаграфій, 12 вучэбных дапаможнікаў, 3 вучэбных праграм, больш чым 100 навуковых і навукова-папулярных артыкулаў.

Развітанне з Ядвігай Дамінікаўнай Грыгаровіч адбылося 1 жніўня ў менскім Чырвоным касцёле, прыхаджнкай якога яна была.

Таварыства Беларускай мовы імя Францішка Скарыны смуткуе з нагоды заўчаснай смерці шчырай беларускі і выказвае спачуванні родным і блізкім нябожчыцы.

Міне зусім няшмат часу, і Ядвігу Грыгаровіч назавуць сярод тых, хто складаў гонар беларускай нацыі праз усе стагоддзі.

Супакой яе душы і вечная памяць у народзе!

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ